*З гісторыі беларускай філалогіі*

## З КАГОРТЫ РУПЛІЎЦАЎ
## (да 75-годдзя з дня нараджэння Ш. Бурака)



У асобе аўтарытэтнага беларускага мовазнаўца доктара філалагічных навук, прафесаріа Леаніда Іванавіча Бурака (1930-1996) і сёння бачыцца нястомны руплівец на ніве роднага слова. У светлых празрыстых глыбінях беларускай мовы ён тонка адчуваў красу, сіпу, выразнасць, гармонію, сугучнасць слоў родных.

Нарадзіўся Леанід Іванавіч Бурак 23 сакавіка 1930 г. у вёсцы Кулыиыно Вілейскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Дзесяць кпасаў мясцовай школы скончыў у 1948 г. У гэтым жа годзе паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пасля завяршэння вучобы (1953) - аспірантура пры Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі, дзе пасля яе заканчэння (1£56) і працаваў малодшым, а з 1963 г. - старшым навуковым супрацоўнікам у сектары сучаснай беларускай мовы. У 1958 г. Л.І. Бурак паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Скпаданазлучаныя сказы ў сучаснай беларускай мове". Менавіта яна стала першым крокам на больш чым трыццацігадовым творчым шляху вучонага, заклала трывалы падмурак яго будучых дасягненняў. Дысертацыйнае даследаванне раз і назаўсёды прадвызначыла кола навуковых інтарэсаў Леаніда Іванавіча ў рэчышчы сінтаксісу беларускай мовы.

З верасня 1966 г. Л.І. Бурак - дацэнт кафедры беларускай мовы. З гэтага часу біяграфія вучонага непарыўна звязана з БДУ. Тут жа без адрыву ад вытворчасці ў 1980 г. паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю на тэму "Далучэнне ў сучаснай беларускай мове", а праз два гады атрымаў званне прафесара. У красавіку 1993 г. быў абраны на пасаду загадчыка кафедры сучаснай беларускай мовы. Памёр 24 снежня 1996 г.

Галоўны накірунак навуковых даследаванняў - сінтаксіс і пунктуацыя беларускай мовы; актуальныя пытанні фармальнай, семантычнай, камунікатыўнай арганізацыі сінтаксічных канструкцый; віды, сродкі сінтаксічнай ,рувязі; інтанацыйнае афармленне сінтаксічных адзінак featureрознага ўзроўню; асаблівасці сінтаксічнай арганізацыі мовы твораў беларускіх пісьменнікаў. Усяго прафесарам Л.І. Бураком апублікавана больш за 100 навуковых ірац (звыш 453 друкаваных аркушаў).

Значным укладам у беларускае мовазнаўства з'яўляецца манаграфія Л.І. Бурака "Далучэнне ў сучаснай беларускай мове" (1975;, у якой усебакова I глыбока раскрыта граматычная сутнасць і асаблівасці дал/чэння, вызначаны месца і ўзаемаадносіны яго з іншымі відамі сінтаксічнай сувязі беларускай мовы, класіфікаваны і сістэматызаваны сінтаксічныя канструкцыі з далучальнай сувяззю з пункту гледжання фармальна-семантычных, інтанацыйных асаблівасцей, выяўлена прадуктыўнасць асобных тыпаў далучальных канструкцый у розных стылях сучаснай беларускай літаратурнай мовы, разглэджаны памежныя з'явы пераходу далучэння ў злучальныя канструкцыі і наадварот.

Шмат зроблена Л.І. Бураком і ў распрацоўцы падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, праграм для вышэйшай школы. Ён аўтар многіх вучэбных дапаможнікаў для філалагічных факультэтаў вышэйшых наЕучальных устаноў: "Пунктуа-

цыя беларускай мовы" (1969, 1976, 1982), "Сучасная беларуская мова" (1974, 1985), "Даведнік па пунктуацыі беларускай мовы" (1980), "Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя" (1987), "Сучасная беларуская мова: Практычныя заняткі" (1989, у сааўт.), "Сучасная беларуская мова: Арфаграфія І пунктуацыя: Практыкум" (1993, у сааўт.). Гэтыя вучэбныя дапаможнікі і сёння застаюцца базіснымі як для студэнтаў, так І для выкладчыкаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, настаўнікаў агульнаадукацыйных школ. Па курсе "Сучасная беларуская мова" падрыхтаваў праграму для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, зацверджаную Міністэрствам адукацыі ў якасці тыповай (1985).

Л.І. Бурак - адзін з аўтараў акадэмічных выданняў "Курса сучаснай беларускай мовы: Сінтаксіс" (1959), "Граматыкі беларускай мовы. Т. 1: Марфалогія" (1962), "Граматыкі беларускай мовы. Т. 2: Сінтаксіс" (1966), "Слоўніка беларускай мовы: Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне" (1987). Больш за 50 артыкулаў мовазнаўчага характару напісана ў энцыклапедычных даведніках: "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя", "Кароткая Беларуская Савецкая Энцыклапедыя", "Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі", "Беларуская мова. Энцыклапедыя".

У айчынным друку ён апублікаваў шэраг навуковых артыкулаў, прысвечаных актуальным пытанням беларускага сінтаксісу і пунктуацыі: "Далучэнне як адзін з відаў сінтаксічнай сувязі" (1960), "Адхіленне ад норм і правіл сучаснай беларускай пунктуацыі" (1965), "Бяззлучнікавае разгортванне прэдыкатыўных адзінак" (1977), "Аб структуры складанага сінтаксічнага цэлага" (1978), "Стылістычная дыферэнцыяцыя некаторых канструкцый сучаснай беларускай мовы" (1981), "Сінтаксічная аднароднасць як вынік структурнага пашырэння сказа" (1983), "Бяззлучнікавае паясненне прэдыкатыўных адзінак" (1987), "Часціцы як адзін са сродкаў сінтаксічнай сувязі" (1989), "Актыўныя працэсы ў сінтаксісе сучаснай беларускай мовы" (1990), "Лексічныя паўторы як сродак сувязі розных сінтаксічных адзінак" (1991) і інш.

Леанід Іванавіч Бурак унёс значны ўкпад у падрыхтоўку спецыялістаў і навуковых кадраў. Чытаў курсы лекцый па сучаснай беларускай мове студэнтам філалагічнага факультэта, студэнтам і выкладчыкам Варшаўскага універсітэта (1976), цыкл лекцый па сінтаксісу беларускай мовы выкладчыкам вышэйшых навучальных устаноў на факультэце павышэння кваліфікацыі, настаўнікам сярэдніх школ і педвучылішч рэспублікі. Пад яго кіраўніцтвам паспяхова былі абаронены многія кандыдацкія дысертацыі (Т.Р. Рамза, Н.У. Чайка, У.І. Кулііковіч І інш.). Ён шчодра дзяліўся сваімі ідэямі з маладымі навукоўцамі, калегамі кафедры.

На працягу некалькіх гадоў узначальваў рэспубліканскае метадычнае аб'яднанне выкпадчыкаў беларускай мовы вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, быў членам спецыялізаваных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый пры БДУ і МДПУ, часта выступаў у якасці афіцыйнага апанента, быў старшынёй рэспубліканскай конкурснай камісіі па разглядзе студэнцкіх навуковых прац, выконваў іншую грамадскую работу. Самаадданая, пленная дзейнасць прафесара Л.І. Бурака ў педагогіцы і навуцы адзначана Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Беларусі, званнем "Заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі" (1990), медалём "Ветэран працы".

Вядомы вучоны, высокакваліфікаваны выкладчык, добры сем'янін, кпапатлівы бацька, тактоўны выхавацель, сціплы і добразычлівы чалавек, ён карыстаўся вялікай павагай сваіх калег у БДУ і ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларуси Такім ён застаецца ў нашай памяці.

*З.1. Бадзевіч,*
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры сучаснай беларускай мовы